*З гісторыі беларускай дзяржаўнасці*

УДК 321+323.2](476)

*М. А. Бяспалая*

## Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: вытокі, умовы, формы

*Разглядаецца працэс узнікнення розных форм беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце геапалітычнай сітуацыі, што склалася ў Еўропе, і з улікам унутраных фактараў і супярэчнасцей. Паказаны роля нацыянальнай праграмы бальшавіцкай партыі (Заходняя вобласць і Заходняя камуна), адносіны савецкай Расіі і Германіі да станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аналізуюцца погляды нацыянальна-дэмакратычнай (БНР) і нацыянальна-рэвалюцыйнай (ССРБ) плыняў нацыянальнага руху на адраджэнне і самавызначэнне беларускага народа.*

Прааналізаваўшы працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці на этапе фарміравання нацыі[1], звернута ўвага на ролю партый, дзеячаў рознай палітычнай арыентацыі ў адстойванні беларускім народам права на самавызначэнне і стварэнне незалежнай рэспублікі. Азначанай праблеме надавалася выключнае грамадскае значэнне, што праяўлялася ў шматлікіх навукова-папулярных публікацыях, афіцыйных і публічных мерапрыемствах, перадачах СМІ і інш. Айчынная навука ўнесла значны ўклад у вывучэнне падзей 1917–1918 гг., якія аналізаваліся рознымі аўтарамі, І. М. Ігнаценкам, М. П. Касцюком, М. С. Сташкевічам, В. А. Круталевічам, У. М. Міхнюком і іншымі, у залежнасці ад часу і мэты іх даследавання.

У сувязі са 100-гадовым юбілеем пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі, абвяшчэння БНР і БССР, сучаснае навуковае асэнсаванне гэтых падзей значна актывізавалася. Былі праведзены круглыя сталы, з'явіліся навуковыя публікацыі Р. Лазько, С. Рудовіча, А. Унучака і інш. [3], якія былі выкарыстаны пры напісанні артыкула.

Звернем увагу на распрацаваную партыяй бальшавікоў праграму рашэння нацыянальнага пытання. Яе асноўныя палажэнні – аб праве на-

[1] *Працяг артыкула:* Бяспалая М. А. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: вытокі, умовы, формы // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 2(30). – С. 5–13.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цый і народаў Расіі на самавызначэнне ажно да аддзялення і стварэння самастойных дзяржаў – былі абнародаваны ў звароце «Да рабочых, салдат і сялян», зацверджаным 25 кастрычніка 1917 г. ІІ Усерасійскім з'ездам Саветаў. «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», апублікаваная 2 лістапада 1917 г., паўтарала партыйную праграму па нацыянальным пытанні і адмяняла нацыянальныя і нацыянальна-рэлігійныя прывілеі, абвяшчала свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і груп і інш. Некаторыя палажэнні праграмы былі замацаваны ў «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа» на ІІІ Усерасійскім з'ездзе Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў 25 студзеня 1918 г.

Як жа рэалізавалася права беларускага народа на самавызначэнне? У чэрвені 1917 г. на з'ездзе Саветаў Мінскай, Віленскай, Магілёўскай губерняў была створана Заходняя вобласць з цэнтрам у Мінску. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў яе склад увайшла Віцебская губерня. У сувязі з наступленнем кайзераўскіх войск у лютым 1918 г. цэнтр вобласці быў перанесены ў Смаленск. У красавіку 1918 г. у яе склад увайшла Смаленская губерня, а ў верасні Заходняя вобласць была перайменавана ў Заходнюю камуну. Аднак гэтыя назвы не раскрывалі этнічную прыналежнасць новых адміністрацыйных утварэнняў.

Улада ў Заходняй вобласці і на Заходнім фронце пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі была сканцэнтравана ў руках Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) і Аблвыканкамзаха (Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту). У склад гэтых органаў уваходзілі ўраджэнцы розных мясцовасцей Расійскай імперыі, якія апынуліся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў гады Першай сусветнай вайны. Кіраўнікі Аблвыканкамзаха – армянін А. Ф. Мяснікоў, латышы В. Г. Кнорын і К. І. Ландар, рускія М. І. Крывашэін, І. М. Любімаў і іншыя стаялі на выразных нацыяналшавіністкіх пазіцыях і актыўна процідзейнічалі намаганням як нацыянальна-дэмакратычнай, так і рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыняў беларускага руху ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж паміж гэтымі плынямі не было духоўнага і ідэйнага адзінства, салідарнасці ў дасягненні нацыянальных ідэалаў. Лідары беларускага нацыянальнага руху імкнуліся дасягнуць аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расійскай рэспублікі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі па ініцыятыве *Беларускага абласнога камітэта* (БАК), які быў створаны ў лістападзе 1917 г. пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў з прадстаўнікоў беларускіх губерняў, пачалася падрыхтоўка да Усебеларускага кангрэса. Камітэт заручыўся падтрымкай Савецкага ўрада, у прыватнасці Наркамата нацыянальнасцей (Наркамнаца) на чале з І. В. Сталіным. Ад Наркамата нават была атрымана фінансавая дапамога на арганізацыю з'езда. Галоўнай умовай падтрымкі ініцыятывы БАК з боку савецкай улады было патрабаванне суадносіць сваю пазіцыю з пазіцыяй Савета ра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бочых і салдацкіх дэпутатаў у Мінску. Імкненне БАК было дастаткова акрэсленае – ён выступаў за аўтаномію Беларусі ў межах Расійскай федэратыўнай рэспублікі.

Да арганізацыі кангрэса Беларускі абласны камітэт далучыў Вялікую беларускую раду, якая стаяла на пазіцыях стварэння беларускай дзяржавы. Такім чынам, ужо на падрыхтоўчым этапе акрэсліліся дзве тэндэнцыі, якія прадвырашылі раскол беларускага нацыянальнага руху.

5 снежня 1917 г. у будынку гарадскога тэатра адкрыўся Першы Усебеларускі кангрэс, на якім прысутнічала 1872 дэлегаты. Адкрыццё кангрэса, паводле ўспамінаў сучаснікаў, было вельмі ўрачыстае. Пры ўваходзе стаяла варта 1-га Мінскага беларускага палка, сцэна была ўпрыгожана нацыянальнымі сцягамі і гербам з выявай «Пагоні». У прэзідыуме кангрэса знаходзіліся кіраўнікі Вялікай беларускай рады на чале з А. Смолічам і Я. Варонкам, Беларускай цэнтральнай вайсковай рады на чале з С. Рак-Міхайлоўскім і прадстаўнікі беларускіх арганізацый з Віцебска, Магілёва, Пецярбурга, Масквы, Кіева і Адэсы. Для ўдзельнікаў кангрэса выступалі хары ў нацыянальных строях пад кіраўніцтвам У. В. Тэраўскага і Саюза беларускай моладзі, артысты 1-га Беларускага тэатра драмы і камедыі на чале з Ф. П. Ждановічам і У. С. Фальскім. Пасля ўступнага слова С. Рак-Міхайлоўскага аб'яднаны хор выканаў гімн «Ад веку мы спалі і нас разбудзілі».

У абраны рабочы прэзідыум былі ўключаны акадэмік Я. Карскі, вядомы дзеяч народніцкага руху А. Бонч-Асмалоўскі, Я. Дыла, І. Серада (старшыня пасяджэння) і інш. Першы дзень работы з'езда прайшоў у фармаце прывітальных прамоў і наказаў дэлегацыям кангрэса з месцаў. Вечарам з канцэртам выступіў хор У. Тэраўскага і была паказана драма У. Галубка «Апошняе спатканне».

У наступныя дні ў працэсе работы кангрэса ў памяшканні былога дваранскага сходу выявіліся тры плыні, якія пазней афарміліся ў фракцыі. Ролю цэнтра выконвала Беларуская сацыялістычная грамада, да якой далучыліся эсэры і шматлікія беспартыйныя. Правае крыло складалася з некалькіх мясцовых памешчыкаў, прадстаўнікоў Віцебскай і Магілёўскай губерняў і клерыкальных колаў. Левая плынь была найбольш шматлікай і падтрымлівалася Аблвыканкамзахам.

Усебеларускі кангрэс быў першай выразнай спробай прадэманстраваць не толькі адзінства нацыянальных сіл, але і іх рашучасць у нацыянальным вызначэнні беларусаў. План бальшавіцкай улады адначасова арганізаваць у Магілёве альтэрнатыўны кангрэс «беларускіх аўтанамістаў», ці «абласнікоў», праваліўся. У першы дзень работы кангрэса ў Мінску выступленне прадстаўніка Аблвыканкамзаха, які назваў беларускі сцяг «национальной тряпкой» і патрабаваў замяніць яго «красным знаменем интернационала», выклікала ўсеагульнае абурэнне дэлегатаў. Але знаходлівы генерал К. Аляксееўскі прыпаў на калена і пацалаваў беларускі сцяг (што спыніла гнеў прысутных).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дэлегаты кангрэса як паўнапраўныя прадстаўнікі беларускага народа сур'ёзна ставіліся да вызначэння шляхоў развіцця Беларусі. Адлюстраваннем гэтага можна лічыць стварэнне секцый і камісій па ўсіх кірунках гаспадарчага і культурнага развіцця: дзяржаўнага будаўніцтва, аграрная, асветы і культуры, вайсковая, фінансавая, мясцовага самакіравання, гаспадарчая, заканадаўчая, народнага здароўя, сацыяльнай апекі, эвакуацыі бежанцаў. Больш дакладныя пытанні распрацоўваліся камісіямі ў межах секцый (дзесяць камісій было створана пры секцыі асветы і культуры). Камісія вышэйшай школы на чале з акадэмікам Я. Карскім распрацавала статут і вучэбны план універсітэта ў Мінску; камісія сярэдняй школы распрацавала яе планы і вучэбныя праграмы, а пачатковых школ – план абавязковага шасцігадовага навучання; камісія прафесійнай асветы прапанавала планы прафесійнага навучання; тэатральная камісія распрацавала планы стварэння народных дамоў перасоўных і стацыянарных тэатраў, а таксама тэмы для конкурсу п'ес; музейная камісія заслухала даклады аб музейных зборах у Беларусі і распрацавала план стварэння акруговых і павятовых музеяў; фальклорная камісія заслухала даклады аб адпаведных зборах і распрацавала план стварэння дзеючай Цэнтральнай фальклорнай камісіі, якая павінна была збіраць і публікаваць фальклорныя матэрыялы; камісія выяўленчага мастацтва распрацавала планы стварэння цэнтральнага і мясцовых мастацкіх музеяў і арганізацыі мастацкіх выстаў. Секцыі і камісіі працавалі адкрыта, можна было свабодна наведаць любое пасяджэнне, заслухаць даклад, паўдзельнічаць у дыскусіі.

На кангрэсе была створана *Рада*, у якую ўвайшлі прэзідыум, а таксама прадстаўнікі ад трох партыйных фракцый, 12 секцый і 15 камісій.

Безумоўна, самым прынцыповым пытаннем было вызначэнне дзяржаўнага статусу. У канцэнтраваным выглядзе галоўная ідэя была сфармулявана Радай кангрэса ў рэзалюцыі, дзе падкрэслівалася, што Усебеларускі з'езд, замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, якое абвешчана рэвалюцыяй, і ўсталёўваючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах беларускай зямлі дзеля выратавання роднага краю і адмежавання яго ад раздзелу і адрыву ад Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, пастанавіў вылучыць са свайго Савета орган краёвай улады ў асобе *Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў* і даручыць яму часовае кіраванне краем. За аснову сваёй працы Усебеларускі Савет павінен быў прымаць усе рашэнні і пастановы І Кангрэса. Рэзалюцыя была дапоўнена заявай аб неабходнасці склікання Беларускага ўстаноўчага сходу і ІІ Усебеларускага кангрэса. Са сказанага вынікае, што дэлегаты ўсведамлялі рашэнні кангрэса як лёсавызначальныя для будучыні беларускага народа.

Аднак 18 снежня, калі дэлегаты кангрэса абмяркоўвалі рэзалюцыю, у зал пасяджэння ўварваліся прадстаўнікі Аблвыканкамзаха, камісары М. Крывашэін і Л. Рэзаўскі, будынак быў акружаны пяхотай, кавале-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяй, пры іх – два браневікі. М. Крывашэін у сваёй бессэнсоўнай прамове (паводле ўспамінаў сведкаў ён быў не зусім цвярозы) заявіў, што кангрэс павінен спыніць работу. Безумоўна, падпарадкоўвацца гэтаму патрабаванню дэлегаты не збіраліся, аднак у залу ўварваліся салдаты. Пасля арышту членаў прэзідыума дэлегаты абралі новых, і работа прадоўжылася, але нядоўга, таму што салдаты са штыкамі накінуліся на ўдзельнікаў Першага Усебеларускага кангрэса. Гвалт над дэлегатамі цягнуўся да пяці гадзін раніцы, а пасля арышту (па адных крыніцах, 25, па іншых – 27 чалавек) іх адвезлі ў будынак Аблвыканкамзаха, некаторых дапрасілі, затым усім прапанавалі на працягу сутак пакінуць Мінск, але гэты дакумент дэлегатамі не быў падпісаны.

На закрытым пасяджэнні Рада Усебеларускага кангрэса аб'явіла сябе яго выканаўчым органам, распусціўшы ўсе іншыя арганізацыі, напрыклад, Вялікую беларускую раду, пакінуўшы толькі Цэнтральную вайсковую раду. Са складу Рады вылучаўся *Выканаўчы камітэт Рады Першага Усебеларускага кангрэса*, якому надаваліся адпаведныя функцыі ў той момант, калі ўзнікнуць неабходныя да гэтага ўмовы.

Спрыяльныя ўмовы для арганізацыйнага афармлення права беларускага народа на самавызначэнне склаліся падчас нямецкага наступлення, якое пачалося 18 лютага 1918 г. На наступны дзень у 16 гадзін савецкія ўстановы пакінулі Мінск, а немцы занялі горад 21 лютага ў 15 гадзін. У гэтыя два дні, калі горад аказаўся свабодным, уладу ў свае рукі ўзяў выканкам Рады Першага Усебеларускага кангрэса і выдаў адпаведны загад. З дапамогай арганізаваных ваенных атрадаў у горадзе быў наведзены адносны парадак. Большага зрабіць было немагчыма, таму што ў Мінску былі сканцэнтраваны ўзброеныя сілы розных палітычных арыентацый – нацыянальнай, прапольскай, прабальшавіцкай, прарасійскай.

21 лютага 1918 г. выканкам Рады апублікаваў *1-ю Устаўную грамату* да народа Беларусі, у якой гаварылася, што права нацый на самавызначэнне можа быць вырашана Устаноўчым сходам. Да яго склікання выканкам Рады аб'явіў сябе вярхоўнай уладай і стварыў *Народны сакратарыят Беларусі* ў складзе 20 міністраў, прадстаўнікоў розных партый.

У гэты ж дзень першыя нямецкія часці ўвайшлі ў горад, а да 25 лютага яны ўжо поўнасцю кантралявалі сітуацыю. Нямецкія салдаты занялі ўрадавы будынак на плошчы Свабоды, канфіскавалі 340 тысяч рублёў у касе сакратарыята, скінулі бел-чырвона-белы сцяг, выгналі служачых. Акупацыйныя ўлады забаранілі палітычную дзейнасць, дэкларуючы аб неабходнасці лічыцца з «законнымі правамі» Расіі на тэрыторыі Беларусі.

9 сакавіка 1918 г. была абнародавана *2-я Устаўная грамата*, якая абвяшчала *Беларускую Народную Рэспубліку*, дэмакратычныя свабоды, ліквідацыю прыватнай уласнасці на зямлю і інш. Рада Усебеларускага з'езда была абвешчана Радай БНР на чале з беспартыйным Іванам (Янкай) Серадой. Большасць яе сяброў належала да БСГ, у яе склад былі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўведзены прадстаўнікі Віленскай беларускай рады, земстваў, гарадскога самакіравання, а таксама прадстаўнікі эсэраў, меншавікоў і бундаўцаў. Праз кіеўскую радыёстанцыю еўрапейскім урадам паведамлялася аб утварэнні БНР і выказвалася просьба аб дыпламатычным прызнанні.

Заключэнне несправядлівага Брэсцкага міру, згодна з якім інтарэсы беларускага народа, патрабаванні яго прадстаўнікоў былі поўнасцю праігнараваны, актывізавала імкненне нацыянальных сіл да стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Па ініцыятыве віленскіх прадстаўнікоў на пасяджэнні Рады, якое доўжылася з 18 гадзін 24 да 10 гадзін 25 сакавіка, адбывалася абмеркаванне пытання аб абвяшчэнні незалежнасці БНР. З 26 прамоўцаў большасць падтрымала прапанову аб абвяшчэнні незалежнасці. Супраць прагаласавалі прадстаўнікі земстваў, бундаўцы, устрымаліся прадстаўнікі эсэраў. 25 сакавіка 1918 г. *3-й Устаўной граматай* абвяшчалася *незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі* і вызначалася тэрыторыя рэспублікі. У выніку яе ў склад БНР былі ўключаны Магілёўская, беларускія часткі Мінскай, Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і іншых губерняў. Аднак ідэя незалежнасці БНР не была падмацавана такімі характэрнымі прыметамі дзяржаўнасці, як сістэма органаў мясцовай улады, уласнае войска, суверэнная тэрыторыя (акупаваная немцамі), канстытуцыя і інш.

Урад Германіі не прызнаў незалежнасці БНР, разглядаючы Беларусь як частку расійскай тэрыторыі і гарантыю атрымання кантрыбуцыі. Нямецкія акупацыйныя ўлады разагналі Раду БНР і ўрад (Народны сакратарыят). Праўда, праз некаторы час камандуючы нямецкай 10-й арміяй дазволіў Радзе ствараць свой мясцовы апарат. Тэрытарыяльныя прэтэнзіі на беларускія землі выказалі ўсе суседзі – Украіна, Літва, Польшча, прадстаўнікі латвійскага нацыянальнага руху [1].

Сітуацыя ў кіруючых органах БНР склалася надзвычай складаная, таму што туды ўвайшлі прадстаўнікі яшчэ адной нацыянальнай плыні – мінскага народнага прадстаўніцтва на чале з Р. Скірмунтам і інш. Яны дабіліся адпраўкі 25 красавіка тэлеграмы з удзячнасцю германскаму імператару, што выклікала раскол Рады БНР. Палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, якія падтрымлівалі працэс утварэння БНР, паступова адыходзілі ад супрацоўніцтва. У маі 1918 г. адбыўся другі раскол Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Найстарэйшая нацыянальная партыя раскалолася на тры групоўкі: Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), ці беларускіх эсэраў, Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў (БПС-Ф) і Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (БСДП).

Наступныя месяцы акупацыі кіраўніцтва БНР займалася вырашэннем унутрыпалітычных спрэчак, спарадычна намагалася наладзіць адносіны з Радай Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР) і вырашыць вострае тэрытарыяльнае пытанне наконт паўднёвага Палесся,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якое па Брэсцкім міры адышло да Украіны. Аднак урад УНР не пайшоў насустрач справядлівым патрабаванням Рады БНР. Фактычна нічым не закончыліся перамовы з прадстаўнікамі ўрада РСФСР. Не мелі поспеху дыпламатычныя місіі, накіраваныя ў Варшаву, Берлін, Берн і інш.

Адносіны Рады БНР з акупацыйнымі ўладамі былі неакрэсленымі. Немцы не прызнавалі Раду, заяўляючы, што знаходзяцца па-за палітыкай, аднак не перашкаджалі ёй праяўляць самастойнасць у галіне культуры і асветы. Кіраўніцтва Рады ў гэтай сітуацыі пачало актыўна ствараць беларускія школы, займацца культурна-асветнай работай, абмяркоўваць пытанні адкрыцця ўніверсітэта і сельскагаспадарчага інстытута.

Летам 1918 г. з'явіліся культурна-асветныя таварыствы ў Мінску, Бабруйску і іншых гарадах, якія займаліся выдавецтвам кніг, падручнікаў. У Мінску былі адкрыты курсы беларусазнаўства, на якіх адбывалася падрыхтоўка настаўнікаў. Для адкрыцця ўніверсітэта была створана спецыяльная камісія на чале з М. В. Доўнар-Запольскім. Актыўны ўдзел у яе працы прымалі акадэмік Я. Ф. Карскі, А. І. Смоліч і інш. У красавіку 1918 г. была заснавана Мінская вышэйшая музычная школа, пазней перайменаваная ў Беларускую кансерваторыю. На аснове калекцыі І. І. Луцкевіча ў Мінску была арганізавана мастацкая выстава. Урад БНР падтрымліваў дзейнасць Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, створанага Ф. Ждановічам. У яго складзе быў хор пад кіраўніцтвам У. В. Тэраўскага, аркестр народных інструментаў (кіраўнік З. Захар) і танцавальная група (кіраўнік Ч. Радзевіч). Спектаклі і канцэрты ладзіліся ў «Беларускай хатцы», а з мая 1918 г. у Беларускім народным доме імя М. Багдановіча. У гэтых памяшканнях ставіла спектаклі і трупа Ф. Аляхновіча.

Аднак Рада БНР не валодала ні палітычнай, ні ваеннай сілай, каб утрымаць свае пазіцыі. Нягледзячы на тое, што ў некаторых месцах былі выбраны мясцовыя рады і аб'яўлена аб перадачы ім некаторых адміністрацыйных абавязкаў, істотнага ўмацавання беларускіх устаноў на месцах не адбылося. Нават пасля таго, як нямецкая ўлада дазволіла ствараць пры ваенных павятовых камендантах групы беларускіх дарадчыкаў, каб рэгуляваць адносіны паміж насельніцтвам і акупантамі. Але стварэнне ўзброеных сіл БНР акупацыйныя ўлады не дазволілі.

Складана вызначыць, чаму Германія прызнала самастойнасць Літвы, Украіны, Польшчы, а прызнаць БНР адмовілася, нягледзячы на вернападданіцкую тэлеграму кайзеру і неаднаразовыя пацвярджэнні лаяльнасці. Хутчэй за ўсё германскія ўлады не верылі ў здольнасць Рады БНР арганізаваць устойлівую і эфектыўную структуру, якая б аказвала ім дзейсную дапамогу. Акрамя таго, на гэты момант ім было відавочна, што палітыка прызнання іншых нацыянальных утварэнняў, напрыклад ва Украіне, не апраўдала сябе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што датычыць адносін беларускага насельніцтва да стварэння нацыянальна-дзяржаўных структур, то яны былі пераважна абыякавымі. Народ не падтрымліваў тонкія палітычныя разлікі лідараў БНР, іх арыентацыю на нямецкую ўладу, бо варожая палітыка акупантаў несла яму голад, разбурэнні, няшчасці. Таму жыхары мястэчак, сёл, гарадоў змагаліся з ворагам. Менавіта па гэтай прычыне сябры Рады і Урада БНР пакінулі горад разам з нямецкімі войскамі, калі 10 снежня 1918 г. Чырвоная армія заняла Мінск.

Такім чынам, працэс абвяшчэння БНР адбываўся ў складаных унутрыпалітычных абставінах. Яны сфарміраваліся пад уплывам мяцяжу польскіх легіёнаў пад камандаваннем Ю. Доўбар-Мусніцкага, акупацыі нямецкімі войскамі значнай тэрыторыі Беларусі, падчас якой былі апрабаваны прынцыпы рабаўніцтва чужой маёмасці, прыніжэння чалавечай годнасці мясцовага насельніцтва. Вельмі важным фактарам, які ўплываў на паслядоўнасць рашэння задачы нацыянальнага будаўніцтва, з'яўлялася адсутнасць адзінства сярод палітычных сіл, што ўдзельнічалі ў працэсе стварэння БНР і яе ўладных структур.

Варта адзначыць, што палітычная палітра была надзвычай стракатай: ад эсэраў, бундаўцаў, прадстаўнікоў кансерватыўных колаў (памешчыкаў, чыноўнікаў, земстваў) да нацыянальных дэмакратычных сіл – спачатку БСГ, а пасля яе расколу – трох новых партый. Адсутнасць адзінства і паразумення паміж імі не садзейнічала зацікаўленасці нямецкіх улад у супрацоўніцтве і прызнанні БНР. Для насельніцтва акупіраванай тэрыторыі самай надзённай праблемай заставалася магчымасць выжывання, а не ўдзелу ў незразумелых для іх палітычных акцыях.

Беларуская нацыянальная ідэя была распаўсюджана сярод шырокіх колаў беларусаў-бежанцаў і тых, хто даўно пражываў і працаваў у расійскіх губернях, сярод салдат і афіцэраў дзеючай арміі – ураджэнцаў Беларусі. Лідарамі беларускага нацыянальнага руху на савецкай тэрыторыі былі дзеячы Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДРП), якая ўзнікла пасля расколу БСГ восенню 1917 г.

8 студзеня 1918 г. па ініцыятыве БСДРП адбылася нарада з удзелам петраградскай арганізацыі БСГ, чыгуначнай і вайсковай арганізацый беларусаў. Кіравалі нарадай А. Р. Чарвякоў, У. В. Скарынка, З. Ф. Жылуновіч і інш. Абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні *Беларускага нацыянальнага камісарыята*. 31 студзеня 1918 г. за подпісам У. І. Леніна быў апублікаваны дэкрэт СНК аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама, БНК), які ўзначаліў А. Р. Чарвякоў. З 1 сакавіка 1918 г. выходзіў друкаваны орган БНК газета «Дзянніца». Усяго выйшла 49 нумароў, рэдактарамі былі З. Жылуновіч (Цішка Гартны) і будучы акадэмік, пісьменнік І. Пятровіч (Я. Нёманскі). «Дзянніца» імкнулася вырашаць такія агульнанацыянальныя задачы, як аднаўленне краю ў нацыянальна-палітычным сэнсе, выяўленне духоўных багаццяў, пахаваных пад стагоддзямі барацьбы, будаўніцтва сацыяльна-прававой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржавы, падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў у краі, павелічэнне колькасці вышэйшых навучальных устаноў, куды былі б шырока адчынены дзверы для дзяцей з народа, і інш.

Адзначым, што на той час Белнацкам і яго аддзяленні былі адзінымі ўстановамі, якія займаліся праблемамі бежанцаў. Наплыў беларусаў, якія жадалі вярнуцца на радзіму, у тым ліку з Расіі, быў такі значны, што планавалася выдаць брашуру з апісаннем, як гэта ажыццявіць.

У ліпені 1918 г. адбылося першае пасяджэнне Беларускага навуковага таварыства, у якім прынялі ўдзел прыкладна 100 чалавек, у тым ліку У. І. Пічэта – будучы рэктар першага беларускага ўніверсітэта (БДУ). У гэтым жа месяцы адбылася нарада беларускіх настаўнікаў, а з 11 ліпеня па 12 жніўня 1918 г. прадаўжалася работа Беларускага народнага ўніверсітэта. За гэты час было падрыхтавана прыкладна 100 настаўнікаў для беларускіх школ, адчыненых у некаторых месцах, напрыклад у Маскве, Петраградзе і інш.

17–21 ліпеня 1918 г. праходзіў Усерасійскі з’езд беларускіх бежанцаў, на якім прысутнічала амаль 200 дэлегатаў. Галоўная ідэя з’езда – аўтаномія Беларусі ў складзе РСФСР. Дзеянні Рады БНР заклеймавалі словамі: «Далоў незалежнасць, якая насаджаецца немцамі з дапамогай памешчыкаў. Хай жыве адзіная, вольная, рабоча-сялянская Беларусь у цесным брацкім яднанні з Расійскай Савецкай Рэспублікай» [4, с. 156]. Такім чынам, у гэты перыяд выразна акрэсліліся два супрацьлеглыя падыходы да рашэння нацыянальнага пытання, у падмурак якіх быў пакладзены класавы прынцып. 19 ліпеня дэлегацыю з’езда прыняў У. І. Ленін.

У пачатку красавіка 1918 г. спыніла дзейнасць БСДРП і былі створаны *беларускія секцыі пры РКП(б)*. У ліпені яны выступілі з прапановай перайменаваць Заходнюю вобласць у Беларуска-Літоўскую камуну.

У верасні 1918 г. адбыўся III з’езд Саветаў Заходняй вобласці. Дэлегацыю Белнацкама ўзначаліў І. В. Лагун, які агучыў прапанову БНК аб стварэнні Беларуска-Літоўскай аўтаномнай рэспублікі ў складзе РСФСР, спасылаючыся на тое, што гэта створыць спрыяльныя ўмовы для адыходу дробнабуржуазных колаў насельніцтва ад Рады БНР. Аднак III з’езд Саветаў Заходняй вобласці адмовіўся ад гэтага плана і абраў назву «Заходняя камуна», якая не мела нацыянальнай прыметы і выразна дэманстравала абраныя савецкай уладай шлях і форму рашэння нацыянальнага пытання.

Наступнай падзеяй, якая радыкалізавала настроі беларускіх нацыянальных дзеячаў савецкай арыентацыі, стаў змест дэкрэта Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК), падпісанага У. І. Леніным і Я. М. Свярдловым 13 лістапада 1918 г. аб ануляванні Брэсцкага міру. У гэтым дакуменце былі наступныя радкі: «Працоўныя масы Расіі, Ліфляндыі, Крыма і Каўказа, вызваленыя Германскай рэвалюцыяй <…> закліканы цяпер самі вырашаць свой лёс…» [Там жа]. Як бачна, у гэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым дакуменце Беларусь не была названа. Кіраўніцтва Белнацкама не пакінула без увагі змест такога важнага дзяржаўнага дакумента. У газеце «Дзянніца» быў апублікаваны артыкул З. Жылуновіча пад назвай «Як жа з Беларуссю?», у якім выказваліся папрокі ў адрас Наркамнаца РСФСР на чале з І. В. Сталіным і кіраўніцтва Заходняй камуны аб ігнараванні інтарэсаў беларускага народа. Маскоўскі камітэт беларускіх секцый РКП(б) 27 лістапада 1918 г. рашуча выказаўся за абвяшчэнне беларускай рэспублікі.

Чаму кіраўніцтва РСФСР адмаўляла беларусам у праве на самавызначэнне? Сярод адказаў на гэтае пытанне адзначым выснову Р. Р. Лазько: «…у Беларусі няма з кім ствараць савецкую рэспубліку – няма надзейных, цалкам "сваіх", <…> здольных не толькі ўспрыняць ідэю нацыянальнай савецкай рэспублікі, але і пагадзіцца з яе падпарадкаваннем, тактычным характарам. <…> беларускія камуністы <…> адважваліся публічна папракаць ленінскі ўрад, персанальна Сталіна, што ігнаруюць права беларускага народа мець сваю аўтаномную рэспубліку ў складзе РСФСР» [3, с. 41; № 3].

У прамежку з 7 па 22 снежня 1918 г. урад РСФСР прызнаў дзяржаўную незалежнасць савецкіх рэспублік Эстоніі, Латвіі і Літвы, са снежня 1917 г. існавала Украінская Савецкая Рэспубліка. У гэтай сістэме прыгранічных савецкіх рэспублік існаваў разрыў, які трэба было запоўніць. Працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове ўступіў у рашаючую стадыю. 21–23 снежня ў Маскве адбылася канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б), на якой прысутнічалі прадстаўнікі петраградскай, маскоўскай, мінскай, саратаўскай і тамбоўскай секцый. Яе правядзенне падтрымаў Наркамнац РСФСР. На канферэнцыі было абрана *Цэнтральнае бюро беларускіх камуністычных* секцый у складзе З. Жылуновіча (старшыня), А. Чарвякова, Я. Дылы і інш. Цэнтральнае бюро разглядалася дэлегатамі як кансалідуючы цэнтр усіх нацыянальных сіл савецкай арыентацыі па афармленні беларускай дзяржаўнасці. Канферэнцыя прыняла найважнейшы дакумент – рэзалюцыю аб утварэнні беларускага савецкага ўрада.

Аднак рашэнні Маскоўскай канферэнцыі не былі прыняты кіруючымі органамі РСФСР і народным камісарам па справах нацыянальнасцей І. В. Сталіным. Яны падтрымлівалі пазіцыю Аблвыканкамзаха і Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б), якія разглядалі Беларусь як адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку ў складзе РСФСР на падставе таго, што ў іх аднолькавае гістарычнае мінулае, геаграфічныя ўмовы, гаспадарчая структура. Напрыклад, сакратар Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) В. К. Кнорын даказваў, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй і што этнаграфічныя асаблівасці, якія адрозніваюць іх ад рускіх, трэба выкараніць. Гэта пазіцыя была падмацавана высновамі спецыяльна створанай адміністрацыйнай камісіі, якая ўсебакова вывучала пытанне і прапанавала захаваць Заходнюю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласць. 23 снежня 1918 г. Усерасійскі ЦВК падтрымаў прапанову камісіі і вызначыў межы Заходняй вобласці ў складзе Смаленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай губерняў. Такім чынам, відавочна, што пазіцыя і кіраўніцтва Заходняй камуны (вобласці) і РСФСР па праблеме дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі поўнасцю супадала.

Аднак на наступны дзень планы адносна беларускага пытання кардынальна змяніліся. 25 снежня 1918 г. І. В. Сталін запрасіў у Маскву кіраўнікоў Заходняй вобласці, таму што «ЦК партыі вырашыў па многіх меркаваннях <…> пагадзіцца з беларускімі таварышамі на ўтварэнне Беларускага савецкага ўрада…» [2, с. 7]. У гэты ж дзень І. В. Сталін запрасіў кіраўнікоў Белнацкама і ЦБ беларускіх секцый З. Жылуновіча, А. Чарвякова, І. Лагуна, Я. Дылу і іншых для абмеркавання пытання аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі і прапанаваў ім прадставіць кандыдатуры ў склад беларускага ўрада. Тэрмінова была склікана нарада прадстаўнікоў Белнацкама, ЦБ беларускіх секцый і Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б). Прысутныя прынялі пастанову, што «…у цяперашні момант поўнасцю наспела неабходнасць абвяшчэння Беларусі як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі» [Там жа]. На нарадзе быў абмеркаваны і склад урада, на пасаду старшыні тайным галасаваннем быў абраны З. Жылуновіч.

Паўстае пытанне аб прычынах такой кардынальнай змены на працягу сутак у намерах савецкага ўрада наконт Беларусі. Адной з галоўных прычын даследчыкі называюць планы Польскай рэспублікі аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., аб’яўленыя ў лістападзе 1918 г. Ужо ў лістападзе–снежні 1918 г. польскія ўлады анексіравалі этнічна беларускія Беластоцкі і Бельскі паветы Гродзенскай губерні, а затым Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай губерні. Адкрыта заяўлялі свае прэтэнзіі на беларускія землі Літва і Украіна. Такім чынам, у канцы 1918 г. стала відавочна, што Савецкая Расія стаяла перад пагрозай інтэрвенцыі з боку Польшчы, якую падтрымлівала Антанта. Таму, на думку даследчыкаў, напрыклад Р. Р. Лазько, не толькі бар’ерам, але «рэспублікай-буферам, ці дыпламатычным інструментам (а можа – разменнай тэрыторыяй. – *М. Б.*) у адносінах з Польшчай павінна была стаць Беларуская савецкая рэспубліка. <…> каб заахвоціць Польшчу да перагавораў <…> неабходна было спачатку аддзяліцца ад яе буфернай тэрыторыяй…» [3, с. 44; № 3].

27 снежня 1918 г. у Наркамнац РСФСР прыехалі старшыня Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) А. Мяснікоў і выконваючы абавязкі старшыні СНК Заходняй вобласці і фронту М. Калмановіч для абмеркавання пытання аб юрыдычнай форме абвяшчэння рэспублікі і арганізацыі ўлады ў Беларусі. Нарада даручыла беларускім арганізацыям падрыхтаваць праект маніфеста аб абвяшчэнні беларускай савецкай дзяржавы.

28 снежня былі ўзгоднены так званыя шэсць прапаноў таварыша Сталіна: колькасны склад урада – 15 сяброў плюс старшыня, тэрыторыя – пяць губерняў – Мінская, Гродзенская, Віцебская, Магілёўская



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Смаленская, абласны партыйны камітэт рэарганізаваўся ў ЦБ Кампартыі Беларусі і інш.

Гэтыя рашэнні сведчаць, што партыйнае і савецкае кіраўніцтва ў пытанні дзяржаўнага вызначэння беларускага народа пераўзышло спадзяванні абедзвюх плыняў беларускага нацыянальнага руху, якія да сакавіка 1918 г. не шлі далей аўтаноміі ў складзе Расіі. Нечаканым было рашэнне аб стварэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі для дзеячаў Аблвыканкамзаха.

29 снежня 1918 г. прадстаўнікі Белнацкама і ЦБ беларускіх камуністычных секцый накіраваліся ў Смаленск на VI Паўночна-Заходнюю партыйную канферэнцыю з праектамі маніфеста аб абвяшчэнні Беларускай рэспублікі і спісам будучага ўрада. Народны камісар па нацыянальных справах І. В. Сталін накіраваў кіраўніцтву Заходняй камуны пісьмо: «Сёння выязджаюць у Смаленск беларусы <…> Просьба ЦК партыі і Леніна прыняць іх, як малодшых братоў, можа, яшчэ нявопытных, але гатовых аддаць сваё жыццё партыйнай, савецкай рабоце» [2, с. 10].

Канферэнцыя, на якой былі прадстаўлены партыйныя дэлегацыі чатырох беларускіх губерняў, а таксама Віленскай, Смаленскай, Чарнігаўскай, пачала працу 30 снежня 1918 г. А. Ф. Мяснікоў як старшыня Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) агучыў галоўны даклад «Аб бягучым моманце», у якім быў выдзелены спецыяльны раздзел «Беларуская Савецкая Рэспубліка». У выніку была прынята рэзалюцыя «Аб абвяшчэнні Заходняй камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай». Канферэнцыя аб’явіла сябе *Першым з’ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б)*, а з’езд абраў Цэнтральнае бюро КП(б) Б з 15 чалавек на чале з А. Ф. Мяснікковым. Сярод членаў ЦК былі толькі два прадстаўнікі беларускіх камуністычных секцый – І. Лагун і З. Жылуновіч, які ў хуткім часе выйшаў з ЦК.

З. Жылуновіч настойліва патрабаваў, каб ЦК КП(б)Б і ўрад рэспублікі ствараліся на парытэтных пачатках: адна палова прадстаўнікоў ад Аблвыканкамзаха, другая – ад Белнацкама. Пазіцыя З. Жылуновіча была абгрунтавана тым, што кіраўніцтва Аблвыканкамзаха выступала супраць утварэння Беларускай рэспублікі. У спрэчку ўмяшаўся І. В. Сталін, які патрабаваў ад З. Жылуновіча падпарадкавання ранейшым рашэнням ЦК РКП(б) па беларускім пытанні.

Пасля працяглых дыскусій 1 студзеня 1919 г. быў сфарміраваны *Часовы рабоча-сялянскі ўрад*. У яго складзе былі сем прадстаўнікоў Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый: З. Жылуновіч (старшыня), У. Фальскі – наркам замежных спраў, Я. Дыла – наркам працы, З. Чарнушэвіч – сацыяльнага забеспячэння, А. Квачанюк – юстыцыі, А. Чарвякоў – асветы, І. Пузыроў – аховы здароўя; дзесяць прадстаўнікоў Аблвыканкамзаха і Паўночна-Заходняга абкама РКП(б), якія занялі най-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш важныя пасады: наркама ваенных спраў – А. Мяснікоў, унутраных спраў – С. Іваноў, шляхоў зносін – І. Савіцкі і інш.

Праблемным з'яўлялася пытанне аб тэрытарыяльным вызначэнні рэспублікі. Маскоўскае кіраўніцтва прапанавала зручны для сябе варыянт: да Беларусі павінны былі адысці Мінская, Гродзенская і Смаленская губерні, аб Віцебскай і Магілёўскай размова не ішла. Аднак у Смаленску было прынята рашэнне аб уключэнні ў склад рэспублікі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай губерняў, а таксама Смаленскай без некалькіх усходніх паветаў, чатыры паўночныя паветы Чарнігаўскай губерні, тры паўднёвыя паветы (Вілейскі, Свянцянскі і Ашмянскі) Віленскай губерні і інш. Такім чынам, тэрыторыя Беларускай рэспублікі была вызначана ў яе этнаграфічных межах.

Відавочна і другое. Усе найважнейшыя рашэнні на этапе абвяшчэння Беларускай рэспублікі прымаліся на партыйнай канферэнцыі. У рэзалюцыі, прынятай па гэтым пытанні, гаварылася, што канферэнцыя лічыць неабходным аб'явіць самастойную Сацыялістычную Рэспубліку. А I з'езд КП(б)Б апублікаваў зварот да насельніцтва, у якім гаварылася, што ён прыняў вялікае рашэнне і абвясціў *Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусь (ССРБ)* на чале з рабоча-сялянскім урадам. І названыя звароты, і склад урада адлюстроўваюць імкненне прадэманстраваць значэнне Аблвыканкамзаха і Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) у працэсе стварэння ССРБ (з канца снежня 1922 г. – БССР).

Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада быў падпісаны і перададзены па радыё ў ноч з 1 на 2 студзеня 1919 г., а 3 студзеня апублікаваны на рускай мове ў газетах. У гэты дзень было аб'яўлена аб самаліквідацыі Аблвыканкамзаха. 5 студзеня ўрад ССРБ пераехаў у Мінск.

Такім чынам, дзякуючы настойлівым намаганням беларускіх нацыянальных колаў, якія арыентаваліся на бальшавікоў і падтрымлівалі савецкую ўладу, а таксама складаным міжнародным умовам, кіраўніцтва РСФСР апошнім было вымушана пайсці на абвяшчэнне савецкай рэспублікі на тэрыторыі Беларусі, зрабіўшы ўсё, каб падпарадкаваць гэты працэс сваім мэтам.

Працэс утварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі быў яшчэ больш складаным, чым БНР. БНР, абвешчаная нацыянальнымі дзеячамі дэмакратычнага кірунку, была вымушана падпарадкоўвацца ціску нямецкіх акупацыйных улад, спрабаваць наладзіць з імі адносіны. Утварэнне ж Савецкай Рэспублікі Беларусь адбывалася, з аднаго боку, пад уплывам настойлівых патрабаванняў нацыянальных колаў, якія прызнавалі савецкую ўладу, з іншага – упартага супраціўлення гэтаму прадстаўнікоў цэнтральных і мясцовых партыйных і савецкіх органаў. Поўнасцю ігнараваць значэнне настойлівасці і ўпэўненасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З. Ф. Жылуновіча, А. Р. Чарвякова, У. І. Лагуна і іншых у важнасці сваёй ідэі не маем падстаў. У значнай ступені дзякуючы іх намаганням, а таксама жаданню многіх тысяч беларусаў вярнуцца на радзіму, што па часе супала з геапалітычнымі планамі бальшавіцкага кіраўніцтва, былі дасягнуты мэты і абвешчана ССРБ. Праўда, адразу давялося пайсці на кампраміс і аддаць ініцыятыву ў кіраванні маладой рэспублікай у рукі бальшавіцка-савецкіх прадстаўнікоў, якія ўбачылі асабіста для сябе станоўчыя моманты ў стварэнні рэспублікі, таму што гэта дазваляла заняць кіруючыя пасады ў межах ССРБ, а не проста заходняй вобласці, а потым, як яны спадзяваліся, у складзе Літоўска-Беларускай ССР.

*1.* Беларуская Народная Рэспубліка: гісторыя і спадчына (да 100-годдзя абвяшчэння незалежнасці БНР) // Беларус. гіст. часопіс / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выд-ва «Пачатковая школа», Ін-т гісторыі НАН Беларусі, БДУ. – 2018. – № 3. – С. 3–18.

*2.* Беларус. гіст. часопіс / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выд-ва «Пачатковая школа», Ін-т гісторыі НАН Беларусі, БДУ. – 2004. – № 3.

*3.* Беларус. гіст. часопіс / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выд-ва «Пачатковая школа», Ін-т гісторыі НАН Беларусі, БДУ. – 2018. – № 2, 3.

*4. Круталевич, В. А.* Рождение Белорусской Советской Республики (на пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 г. – декабрь 1918 г.) / В. А. Круталевич ; ред. А. Ф. Хацкевич, И. А. Юхо. – Минск : Наука и техника, 1975. – 334 с.

*M. Byaspalaya*

**Formation of the Belarusian statehood: origins, conditions, forms**

*The emergence process of various forms of the Belarusian statehood in the context of the geopolitical situation in Europe in view of external factors and contradictions is considered. The role of the Bolshevik Party's National Program (Western Region and Western county), as well as the attitude of Soviet Russia and Germany to the formation of the Belarusian statehood are underlined. The views of the national democratic (BNR) and the national revolutionary (SSRB) streams of the national movement on the revival and self-determination of the Belarusian people are analyzed.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 09.01.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Да артыкула М. А. Бяспалай «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці: вытокі, умовы, формы»*




Мал. 1. Члены ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняй вобласці і фронту



Мал. 2. Народны сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі (няпоўны склад). Злева направа: сядзяць – А. Бурбіс, Я. Серада, Я. Варонка, В. Захарка. Стаяць – А. Смоліч, П. Крачэўскі, К. Езавітаў, А. Аўсянік, Л. Заяц. Мінск, 1918 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Мал. 3. А. Р. Чарвякоў



Мал. 4. З. Ф. Жылуновіч
(Цішка Гартны)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ